


Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Эйнштэйн. Нікан. Дама. Кюры. Атам. Круг. Каломба. Лямка. Амт. Воз. Тата. Султан. Цір. Колі. Пасаг. Аграном. Атара. Сердалік. Амур. Ёта. Ака. Лакунак. Бяда. Улар. Віраж. Апора. Лоб. Ажан. Капсуль.

**Па вертыкалі:** Сахараў. Ромул. Фраў. Атрад. Каваціна. Капіца. Оні. Орда. Этна. Рама. Увага. Імага. Палін. Накат. Арол. Акт. Прарок. Нема. Жаба. Лета. Док. Кара. Матрос. Лён. «Ліліта». Веліхаў. Сіг. Кактэйль.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.37 | 19.33 | 12.56 |
| Віцебск — | 6.25 | 19.24 | 12.59 |
| Магілёў — | 6.27 | 19.23 | 12.56 |
| Гомель — | 6.25 | 19.19 | 12.54 |
| Гродна — | 6.53 | 19.48 | 12.55 |
| Брэст — | 6.55 | 19.47 | 12.52 |

## Месяц

*Першая квадра ў 20.09.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.** Лізаветы, Аляксандра, Арсенія, Астапа, Гаўрылы, Данілы, Івана, Ігната, Макара, Нікадзіма, Паўла, Пятра, Якава, Яфрэма.*
***К.** Марыі, Кіра, Пятра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**1362** год — адбылася бітва на рацэ Сінія Воды (левы прыток Паўднёвага Буга) паміж войскам ВКЛ і аб'яднанымі войскамі Крымскай, Перакопскай і Ямбалукскай ордаў. Увосень 1362 года Альгерд з войскам, сабраным у беларускіх землях і папоўненым апалчэнцамі з Валыні і Кіеўшчыны, рушыў з Кіева на заходняе Падолле. Войска татараў, якое ўзначальвалі Кутлубуг, Качубей і Дзімітр, падзялялася на тры палкі. Альгерд паставіў 6 палкоў у лінію глыбокай абароны ў некалькі радоў, што не давала магчымасці варожай конніцы зайсці ў тыл. Татарскае войска вымушана было пачаць франтальны бой. Лёгка адбіўшы націск, войскі Альгерда нанеслі ўдар у адказ у цэнтр фронту і па флангах. Пасля нядоўгага бою супраціўленне праціўніка было зламана, татары ратаваліся ўцёкамі. Асабліва вызначыліся ратнікі з Навагрудка, якімі камандавалі Карыятовічы. У выніку гэтай слаўнай перамогі ВКЛ пашырыла сваю тэрыторыю да вусцяў Дняпра і Днястра, замацавала ў сваім складзе Чарнігава-Северскія землі, Падолле, Валынь і Кіеўшчыну. Пачалося вызваленне ўсходне-славянскіх земляў ад ардынскага панавання.



**1712** год — нарадзіўся (горад Навагрудак) Сцяпан Міхаіл Аскерка, эканаміст, юрыст. З 1733 года — у Прусіі, саветнік юстыцыі караля Фрыдрыха II. Упершыню ўвёў у навуковы ўжытак слова «план», выказаў ідэі, якія выканалі вядучую ролю ў фарміраванні так званага «прускага» шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Дата смерці невядомая.

**1921** год — «Сучасная цывілізацыя — гэта абмен кашто̆ўнасцяў на выгоды», — сцвярджаў Станіслаў Лем, які падарыў свету мноства падстаў для роздуму пра веліч і небяспекі цывілізацыі. Славуты польскі пісьменнік, філосаф, публіцыст, адзін з класікаў сучаснай фантастыкі нарадзіўся ў такі ж дзень 1921 года. Сярод напісаных ім кніг — раманы «Салярыс», «Магеланава воблака», «Чалавек з Марса», «Астранаўты», шматлікія аповесці і апавяданні.

## Было сказана

**Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:**

*«Прыслухоўвайцеся больш да чужых слоў, а не да свайго славаслоўя».*

■ Крымінал

# КАВА З МАРЫХУАНАЙ

**У Брэсце на мяжы затрыманы расіянін, які намерваўся правезці 42 кілаграмы марыхуаны. Багажу ў 36-гадовага падарожніка не было, таму памежнікі вырашылі ўважліва агледзець яго машыну.**

Разам з супрацоўнікамі мытні яны правялі паглыблены агляд аўтамабіля. Прыбыў і кінолаг з сабакам, і жывёліна праз некаторы час знайшла наркотыкі. Паміж задняй сценкай пасажырскага сядзення і багажнікам знаходзілася 79 пакецікаў па 350 грамаў кожны. Пад запасным колам была абсталявана схованка, дзе ляжала яшчэ 39 такіх пакецікаў. Кур'ер падрыхтаваўся грунтоўна: усе пакеты былі змешчаны ў вакуумную ўпакоўку і шчодра перасыпаны кавай. Аўтамабіль і вадзіцель затрыманы.

**Яна СВЕТАВА**

## УСМІХНЕМСЯ




**Сёння была на рынку! Даведалася, што існуе тры памеры адзення: «на вас», «не на вас» і «трэба мераць».**

Муж прыйшоў з працы і пытаецца ў жонкі:
— Ну, як справы, мая салодкая?
Яна:
— Усё добра, дарагі! Боршч зварыла, катлет насмажыла, вокны працерла, дзіцячыя рэчы ўсе перамыла, вось сяджу, шкарпэткі вяжу. Але, заўтра, калі зноў забудзешся заплаціць за інтэрнэт, я цябе прыб'ю!

**Мужчына! Дапамагай жонцы ў прыбіранні кватэры — падымай ногі, калі яна пыласосіць!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.808. Індэкс 63850. Зак. № 3979.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 верасня 2013 года.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |